______________________________________________
(miestas / rajonas, mokykla)

_____ klasės mokinio (-ės) ______________________________
(vardas ir pavardė)

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

## РОДНАЯ МОВА (БЕЛАРУСКАЯ)

2017 m. mokyklinio brandos egzamino užduotis

Pagrindinė sesija

2017 m. birželio 21 d. Trukmė – 4 val. (240 min.)

**NURODYMAI**

- Pasitikrinkite, ar egzamino užduočių sąsiuvinyje nėra tuščių lapų arba kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
- Užrašykite savo vardą ir pavardę, miestą / rajoną, mokyklą ir klasę tam skirtoje užduoties sąsiuvinio vietoje.
- Rašykite aiškiai, įskaitomai tamsiai mėlynai rašančiu rašikliu. Koregavimo priemonėmis naudotis negalima. Neaiškiai parašyti, pribraukyti, už ribų parašyti atsakymai vertinami 0 taškų.
- Atlikdami teksto suvokimo užduotis (II egzamino dalis), į klausimus atsakykite glaustai ir aiškiai. Jūsų atsakymai turi tilpti paliktose eilutėse.
- III egzamino dalyje pateiktos trys rašinio temos ir du tekstai interpretacijai. Įdėmiai juos perskaitykite, pasirinkite ir parašykite vieną rašinį arba vieną teksto interpretaciją.
- Turite parašyti 250–400 žodžių (A4 formato 1–2 puslapiai) tekstą. Vertinant bus atsižvelgiama ir į darbo apimtį. Švarraštyje suskaičiuokite žodžius. Paraštėje **pažymėkite 250 žodžių ribą**.
- Jeigu pirmiausia rašote juodraštyje, pasilikite pakankamai laiko darbui perrašyti į švarraštį. **Juodraštis nebus tikrinamas ir vertinamas.**

Linkime sėkmės!

**VERTINIMAS**

| **II dalis (teksto suvokimas)** | **III dalis (teksto kūrimas)** | **TAŠKŲ SUMA** |
|---|---|---|
| 30 taškų | 40 taškų | 70 taškų |
| | | |

Vertinimo komisija: ______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

______________________________
(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2017 m.

# II egzamino dalis

# TEKSTO SUVOKIMAS

*Прачытайце тэкст і выканайце змешчаныя пасля яго заданні.*

**Масавая культура** або **поп-культура** – разнавіднасць культуры індустрыяльнага грамадства. Іншыя яе назвы – камерцыйная, спажывецкая, папулярная, агульнадаступная культура. Яна складаецца з такіх з'яў, як спорт, забавы, побыт, музыка, літаратура, сродкі масавай інфармацыі, выяўленчае мастацтва і г. д.

Змест масавай культуры абумоўлены штодзённымі падзеямі, імкненнямі і запатрабаваннямі, якія складаюць жыццё большасці насельніцтва. Яна з'яўляецца своеасаблівым "мастацтвам для ўсіх, для кожнага". Яе ўзнікненне было абумоўлена навукова-тэхнічнай рэвалюцыяй, урбанізацыяй, размываннем тэрытарыяльных і сацыяльных межаў. Сам тэрмін "масавая культура" ўзнік у 1940-х гадах у ЗША. Масавая культура атрымала найбольшае распаўсюджанне ў другой палове XX ст. у сувязі з хуткім развіццём сродкаў масавай інфармацыі: тэлебачання і радыё, аўдыё- і відэатэхнікі, Інтэрнэту і г.д.

Асноўнымі кірункамі масавай культуры можна лічыць наступныя: у літаратуры – дэтэктыў, прыгоды, фантастыка; у кіно – баявік, трылер, меладрама; у выяўленчым мастацтве – карыкатура, комікс; у музыцы – рок- і поп-музыка; а таксама разнастайныя шоу. Тыповымі героямі і сімваламі масавай культуры з'яўляюцца, напрыклад, суперагент Джэймс Бонд, Тэрмінатар, разнастайныя супермэны і інш.

Па свайму ўзроўню масавая культура стаіць звычайна ніжэй за элітарную і народную культуру. Тым не менш, яна мае пэўныя плюсы. Перш за ўсё, яна "дэмакратычная", таму што звернутая да ўсіх людзей без адрознення класа, нацыі, узроўню багацця або беднасці. Акрамя таго, масавая культура кампенсуе эмацыйны дэфіцыт, бо яна носіць забаўляльны характар. Кожны мае права атрымаць эмацыйную разгрузку шляхам прагляду фільма ці чытання кнігі. Дзякуючы тэхналогіям больш даступнай для народа становіцца элітарная культура: можна не хадзіць у тэатр, а знайсці неабходную музыку або пастаноўку ў Інтэрнэце. А гэта павышае сярэдні каэфіцыент адукацыі людзей. Хоць масавая культура і валодае меншай мастацкай каштоўнасцю, але затое мае вельмі шырокую публіку. Варта адзначыць, што масавая культура зблiжае людзей. Менавіта дзякуючы ёй мы можам знайсці сяброў па перапісцы з падобнымі інтарэсамі, абмеркаваць у сетцы Інтэрнэт якую-небудзь кнігу, фільм, карціну або падзею. Масавая культура мае яшчэ адзін важны плюс: ахопліваючы ўсе сферы жыцця і ўсе пласты насельніцтва, сціраючы нацыянальныя, геаграфічныя, этнічныя, сацыяльныя мяжы, яна спрыяе развіццю пачуцця адзінства людзей у свеце, дазваляе ім мець зносіны на адной мове, няхай гэта будзе поп-музыка, поп-літаратура, папулярныя шоу і масавае кіно, модныя тэндэнцыі і інш.

Разам з тым, відавочна, што гэты від культуры накіраваны на вытворчасць "масавага чалавека", які запазычвае свае думкі з радыё- і тэлеперадач, глянцавых часопісаў, рэкламы. А запазычваючы думкі і ўзоры паводзін, чалавек становіцца проста выканаўцам зададзеных роляў, г. зн. ён абязлічваецца. Прадукт масавай культуры карыстаецца папулярнасцю сярод шырокага кола насельніцтва, што азначае раўнаванне густаў, меркаванняў, патрэбаў, стылю – гэта значыць, ізноў гаворка ідзе пра страту ідэнтычнасці і слабую магчымасць самавыяўлення праз элементы масавай культуры. Гэта вядзе да знясілення творчага патэнцыялу грамадства, застою ў культурнай сферы і, як вынік, да заняпаду грамадства ў цэлым, бо грамадства, якое задавальняецца толькі масавай культурай, асуджана на дэградацыю.

Але, хоць попыт на масавую культуру і высокі, заўсёды знойдуцца людзі, якія не стануць закрываць вочы на яе недахопы і з пачуцця пратэсту ці простага жадання ствараць нешта сапраўды вартае і арыгінальнае будуць тварыць для вузкай аўдыторыі або для сябе тое, што апярэдзіць сваё пакаленне на некалькі дзесяцігоддзяў. Гэта будзе ўжо іншая культура, адрозная ад масавай па ўсіх крытэрыях, але менавіта ёй будзе наканавана развіваць грамадства, і пакуль такая культура будзе існаваць, грамадству не страшна забаўляць сябе такой прыемнай і простай, такой даступнай і яркай поп-культурай.

(Паводле Я. Тукбаевай)

## Заданні да тэксту

| | *Балы* I | II | III |
|---|---|---|---|
| **1.** Вызначце стыль тэксту. *Правільны адказ абвядзіце.*<br>**А** Публіцыстычны.<br>**Б** Мастацкі.<br>**В** Афіцыйна-дзелавы.<br>**Г** Размоўны.<br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **2.** Запішыце **тры** рысы гэтага стылю.<br>1 – ______<br>2 – ______<br>3 – ______<br>*(3 балы)* | ___ | ___ | ___ |
| **3.** Выпішыце з тэксту **чатыры** сінонімы да словазлучэння *масавая культура*.<br>______<br>*(2 балы)* | ___ | ___ | ___ |
| **4.** Што складае змест масавай культуры? *Адкажыце словамі тэксту.*<br>______<br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **5.** З **другога** абзаца выпішыце словы, якія раскрываюць сутнасць паняцця “масавая культура”.<br>______<br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |

| Сума балаў за заданні 1–5 *(макс. 8 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

*Балы*
*I II III*

**6.** Што абумовіла ўзнікненне “масавай культуры”?

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

**7.** Што спрыяла распаўсюджванню масавай культуры ў ХХ ст.?

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

**8.** Выкарыстоўваючы матэрыял для даведак, у адпаведныя радкі запішыце прыкметы названых відаў культур.

*Элітарная культура –* ______________________________

______________________________________________

*Народная культура –* ______________________________

______________________________________________

*Масавая культура –* ______________________________

______________________________________________

**Матэрыял для даведак:**

– Невядома аўтарства большасці твораў.
– Арыентацыя на камерцыйны поспех.
– Наведванне канцэртаў класічнай музыкі.
– Перадаецца з пакалення ў пакаленне.
– Патрэба ў спецыяльнай адукацыі.
– Павышэнне ролі кіно і тэлебачання.

*(3 балы)*

**9.** Каму адрасавана масавая культура?

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

| Сума балаў за заданні 6–9 *(макс. 6 балаў)* | | | |
|---|---|---|---|

*Балы*
*I II III*

**10.** Растлумачце сэнс словазлучэння *чалавек абязлічваецца*.

___

___

*(2 балы)* ___ ___ ___

**11.** Чаму, на думку аўтара артыкула, *грамадства, якое задавальняецца толькі масавай культурай, асуджана на дэградацыю*?

___

___

___

*(3 балы)* ___ ___ ___

**12.** Запішыце **тры** сказы, у якіх выкажыце *свае ўласныя* адносіны да масавай культуры.

1. ___

___

2. ___

___

3. ___

___

*(3 балы)* ___ ___ ___

**13.** Пазначце сказы, у якіх гаворыцца пра станоўчыя рысы масавай культуры:

1) дазваляе расслабіцца, арганізуе псіхалагічную разрадку;
2) уніфікуе свядомасць;
3) фармуе ілжывыя імкненні і патрэбы;
4) сцвярджае простыя і зразумелыя ўяўленні аб людзях і іх узаемаадносінах;
5) фармуе міфы ў свядомасці людзей (міф папялушкі, міф простага хлопца);
6) дазваляе быць у курсе падзей, якія адбываюцца ў свеце;
7) паніжае агульную планку духоўнай культуры грамадства.

*(1,5 балы)* ___ ___ ___

| | | | |
|---|---|---|---|
| Сума балаў за заданні 10–13 *(макс. 9,5 балы)* | | | |

*Балы*
*I II III*

**14.** Вызначце, ілжывымі або праўдзівымі з'яўляюцца выказванні, ставячы знак + у адпаведную графу.

| | ТАК | НЕ |
|---|---|---|
| Масавая культура сфармавалася ў Заходняй Еўропе ў сярэдзіне XX стагоддзя. | | |
| Прадукты масавай культуры можа спажываць толькі пэўная група людзей. | | |
| З'яўленне масавай культуры звязана з працэсамі дэмакратызацыі, урбанізацыі і навукова-тэхнічнага прагрэсу. | | |
| Увесь сучасны кінематограф – гэта з'ява толькі масавай культуры. | | |
| Масавая культура мае ярка выражаны камерцыйны характар. | | |
| Гламурна апранаюцца людзі, якія валодаюць бездакорным густам. | | |
| Культура бывае двух відаў – матэрыяльная і духоўная. | | |

*(3,5 балы)* ___ ___ ___

**15.** Аднавіце **тры** прыказкі, спалучаючы іх часткі з левага і правага слупка.

| | |
|---|---|
| Вучоны водзіць, | такая і слава. |
| Кніжка чалавеку, | калі з дурнем павядзешся. |
| Розуму не набярэшся, | а невучоны следам ходзіць. |
| У сваім краю | што ліпа пчолцы. |

*(3 балы)* ___ ___ ___

| Сума балаў за заданні 14–15 *(макс. 6,5 балы)* | | | |
|---|---|---|---|

**ЧАРНАВІК**

**ЧАРНАВІК**

АЦЭНКА ВЫКАНАННЯ ТЭСТА

| | Макс. сума | Члены камісіі | | |
|---|---|---|---|---|
| | | I | II | III |
| Сума балаў за заданні 1–5 | 8 | | | |
| Сума балаў за заданні 6–9 | 6 | | | |
| Сума балаў за заданні 10–13 | 9,5 | | | |
| Сума балаў за заданні 14–15 | 6,5 | | | |
| **Сума балаў** | 30 | | | |
| **Акругленая сума балаў** | 30 | | | |

III egzamino dalis

# TEKSTO KŪRIMAS

*З прапанаваных трох тэм сачыненняў і двух тэкстаў для інтэрпрэтацыі Вы павінны выбраць адну тэму альбо адзін тэкст і напісаць працу.*

*Ваша праца павінна быць аб'ёмам 250–400 слоў (1–2 старонкі фармата А4). У чыставіку ад пачатку працы адлічыце 250 слоў, пазначце месца, дзе яны заканчваюцца, і запішыце гэтую колькасць на палях.*

## ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

**1.** Што такое чалавек перад знішчальнаю сілай бесчалавечных абставін? (Па творах Васіля Быкава).

**2.** Якое яно – сапраўднае мастацтва? (Па творах беларускай літаратуры).

**3.** Канфлікт паміж героямі камедыі В. Дуніна-Марцінкевіча "Пінская шляхта": выпадковасць ці заканамернасць?

## ТЭКСТЫ ДЛЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

**4. А. Вярцінскі**

Абрастаем.
Паперамі, рэчамі,
абавязкамі,
звычкамі,
стрэчамі.
Абрастаем болямі, охамі.
Як валун абрастае мохам,
абрастаем мохам абставін.
Абрастаем даўгамі, хвастамі.
Абрастаем, як бераг кустамі.
"Дзе чужое, дзе наша? –
пытаем. –
Дзе расцём, а дзе абрастаем?" –
Мы пытаем.
Гэта няпроста
абрастанне адрозніць ад роста.
На душы маёй —
шчэць густая.
Адчуваю:
ідзе абрастанне.
Адчуваю: ідзе абрастанне.
Ды спыніць яго я не ў стане.
А быць можа,
спыніць я ў стане?
Можа, ўзяць
ды ўзняць паўстанне?
Можа, ўсёю першаасноваю
абудзіцца па-вясноваму?

Жыць пачаць са старонкі новай –
яшчэ чыстай,
яшчэ вясновай?
Толькі як жа мы паўстанем,
калі кожны міг абрастаем,
расстаёмся з самімі сабою –
нехта з боем,
а нехта без бою...

**5. Маці Тэрэза** *(1910–1997, каталіцкая манахіня, заснавальніца ордэна Міласэрнасці, лаўрэатка Нобелеўскай прэміі міру, прылічана да ліку святых)*

Людзі часта бываюць безразважнымі
І адно пра свой інтарэс дбаюць.
Прабачай ім – што будзе, то будзе.
Калі хочаш людзям дабра,
То цябе абвінавацяць у сябелюбстве
І нізкіх намерах.
А ты будзь добры – што будзе, то будзе.
Калі дасягнеш поспеху,
Знойдзеш шмат ілжывых сяброў
І яшчэ больш сапраўдных ворагаў.
Старайся дабіцца поспеху – што будзе, то будзе.
Калі будзеш адкрыты і шчыры,
Людзі пакарыстаюцца табой для сябе.
Будзь адкрыты і шчыры – што будзе, то будзе.
А нехта за адну ноч можа
Знішчыць тое, што ты будаваў праз гады.
Будуй сваё – што будзе, то будзе.
Калі знойдзеш спакой і шчасце,
Многія будуць табе зайздросціць.
Будзь шчаслівы – што будзе, то будзе.
Пра дабро, якое чыніш сёння,
Людзі, напэўна, забудуць заўтра.
Рабі дабро – што будзе, то будзе.
Аддавай усё, колькі можаш,
А табе скажуць, што гэтага мала.
Што будзе, то будзе – аддавай колькі можаш.
Бачыш, у астатнім рахунку
Лічыцца толькі тое, што было паміж табой
і Богам.
Бо паміж табой ды “імі”
І так ніколі нічога не было.

# ЧАРНАВІК

*Працяг чарнавіка на 12-й старонцы*

# ЧЫСТАВІК

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 13-й старонцы***

***Працяг чарнавіка***

***Працяг чарнавіка на 14-й старонцы***

***Працяг чыставіка***

| *I* | *II* | *III* |
|---|---|---|
| | | |

***Працяг чыставіка на 15-й старонцы***

***Працяг чарнавіка***

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

| III частка (сачыненне) | | | | Сума балаў |
|---|---|---|---|---|
| **Змест** | **Структура тэксту** | **Стыль мовы** | **Грамат-насць** | |
| 20 балаў | 4 балы | 4 балы. | 12 балаў | 40 балаў |
| | | | | |